**А. І. Шышова (Мазыр, Мазырскі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна)**

# ПРАЦА З ДЫЯЛОГАМІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

Развіццѐ моўных здольнасцей і маўленчай дзейнасці малодшага школьніка – найважнейшы кампанент лінгвістычнай адукацыі як часткі адукацыйнага працэсу ў сучаснай школе. Без развіцця звязнага маўлення школьніка нельга вырашыць задачу яго гарманічнага развіцця, а значыць, немагчыма ў поўнай меры навучыць яго адаптавацца ў сацыяльным асяроддзі і падрыхтаваць да самастойнага жыцця. Дапамогуць гэтаму ўрокі літаратурнага чытання і арганізацыя ў час іх правядзення практычнай дзейнасці вучняў праз дыялог.

Слова *дыялог* прыйшло да нас з грэчаскай мовы, дзе *diálogos* ўжывалася ў значэнні ‗размова, гутарка двух'. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы падае наступныя значэнні гэтага слова: 1) размова паміж дзвюма або некалькімі асобамі; 2) частка літаратурнага твора ў выглядзе размовы дзеючых асоб; літаратурны твор, напісаны ў форме размовы [1, 228].

Выказванні-рэплікі дыялогу ўяўляюць сабой розныя віды апавядальных, пабуджальных і пытальных сказаў, якія характарызуюцца сціслацю, выкарыстаннем гутарковых элементаў. У рэпліках часта ўжываюцца звароткі, часціцы, выклічнікі, эліптычныя канструкцыі (скарочаныя выказванні), паўторы пытальных, клічных і няпоўных сказаў. Акрамя гэтага, удзельнікі дыялогу выкарыстоўваюць невербальныя сродкі зносін (міміку, жэсты, змаўчанні і інш.). ―Ва ўмовах дыялогу, – адзначаецца лінгвістамі, – актывізуецца ўзаемадзеянне сінтаксічных, лексічных і інтанацыйных сродкаў сказа і яго сэнсавых сувязей з папярэднім або наступным тэкстамі‖ [2, 75]. Вось чаму дыялог мае вялікае значэнне для развіцця вуснага і пісьмовага маўлення школьнікаў, асабліва малодшых.

На жаль, аналіз падручнікаў па літаратурным чытанні для 3–4 класаў паказвае, што праца з дыялогамі ў іх яшчэ не знайшла належнага адлюстравання. Заданні ў падручніках носяць пераважна аднатыпны характар (чытанне па ролях і інсцэніроўка):

– падрыхтуйцеся да чытання па ролях [3, ч. 1, 28, 59];

– выберыце з тэксту ўрывак, які вам хацелася б прачытаць па ролях [3, ч. 1, с. 39];

– разыграйце смяшынку па ролях [3, ч. 1, 67];

– пералічыце, колькі дзеючых асоб у казцы. Прачытайце твор па ролях [3, ч. 1, 81];

– падрыхтуйцеся да выразнага чытання размовы сняжынак па асобах [3, ч. 2, 12, 24];

– прачытайце казку па асобах. Перадайце інтанацыяй, як паводзілі сябе людзі на сходзе [3, ч. 2, 58];

– падрыхтуйцеся чытаць тэкст па ролях [4, ч. 1, 29, 37];

– прачытайце тэкст самастойна і падрыхтуйцеся чытаць яго па ролях [4, ч. 1, 39];

– размяркуйце казку па ролях і прачытайце яе [4, ч. 2, 22];

– прачытайце казку па ролях і падрыхтуйцеся праінсцэніраваць яе [4, ч. 2, 30];

– прачытайце смяшынку па ролях [4, ч. 2, 31];

– падрыхтуйцеся чытаць па ролях размову дзеда і хлопчыка [4, ч. 2, 55];

МГПУ им. И.П.Шамякина

– размяркуйце байку па ролях і праінсцэніруйце яе [4, ч. 2, 111];

– размяркуйце тэкст па ролях. Падрыхтуйцеся да выразнага чытання сцэнкі [4, ч. 2, 126].

Аднак, каб урок быў больш цікавы і прадуктыўны, каб у поўнай меры развіваліся маўленчыя навыкі дзяцей, настаўнік павінен праявіць свае творчыя здольнасці і прапанаваць дзецям і іншыя віды працы з дыялогамі:

1) знаходжанне ў тэксце рэплікі-рэакцыі на папярэднюю – рэпліку-стымул – і чытанне яе ўголас;

2) узнаўленне па памяці рэплікі-рэакцыі на прачытаную рэпліку-стымул;

3) аднаўленне дыялогу з рэплік, якія трэба паставіць у пэўным парадку, на аснове твора з падручніка або іншага, – напрыклад, мініяцюры М. І. Сладкова ―Ліса і Вожык‖ :

| Рэплікі, з якіх трэба аднавіць дыялог | Аўтарскі дыялог |
|---|---|
| – Ды нейкі ты з імі, брат, неядомы!..<br>– А што, Ліса, я з калючкамі непрыгожы, ці што?<br>– Дык які ж я такі, з калючкамі?<br>– Ды не тое, каб нязграбны…<br>– Ты, Вожык, такі добры і прыгожы, ды толькі калючкі табе не да твару!<br>– Ды не тое, каб непрыгожы…<br>– Можа, я з калючкамі нязграбны? | – Ты, Вожык, такі добры і прыгожы, ды толькі калючкі табе не да твару!<br>– А што, Ліса, я з калючкамі непрыгожы, ці што?<br>– Ды не тое, каб непрыгожы… – Можа, я з калючкамі нязграбны?<br>– Ды не тое, каб нязграбны… – Дык які ж я такі, з калючкамі?<br>– Ды нейкі ты з імі, брат, неядомы!..<br>(М. І. Сладкоў. Пераклад з рускай А. В. Солахава) |

4) прыдумванне працягу дыялогу. Напрыклад:

– Сыночак, а чым ты пазіраеш?

– Пазіраю? Вочкамі.

– А …

– …;

5) выбар з 2–3 прапанаваных рэплік адной, якая адпавядае па сэнсе дадзенай: – Коля, бабуля перадавала табе прывітанне.

(1. – Ладна.

2. – Добра.

3. – Магла б і сама прыехаць.

4. – Дзякую, мама! Мне вельмі прыемна.);

6) стварэнне п‘есы паводле вывучаных казак і апавяданняў, напрыклад, казкі ―З рога ўсяго многа‖ (для гэтага можна стварыць некалькі творчых груп: адну – для

МГПУ им. И.П.Шамякина

напісання п‘есы, другую – для яе інсцэніроўкі. трэцюю – для падрыхтоўкі сцэны і інш.); 7) складанне дыялогу з ветлівымі словамі па прапанаваных тэмах, напрыклад: ―Знаѐ мства‖ , ―Нечаканая сустрэча‖ , ―Тэлефонная размова‖ , ―Як даехаць да вакзала?‖ , ―У магазіне‖ (для правядзення творчай працы настаўнік стварае 5 груп вучняў і прапаноўвае кожнай з іх выцягнуць адну з пяці паштовак, на якіх знаходзяцца тэмы дыялогаў);

8) арганізацыя ў парах вучняў інтэрв‘ю паводле зместу прачытанага твора (на пачатку гэтага віду працы пытанні для інтэрв‘ю кожны вучань можа падрыхтаваць дома).

Праведзеныя анкетаванні вучняў 4-х класаў САШ № 12 г. Мазыра, дзе на ўроках літаратурнага чытання шырока выкарыстоўваліся розныя віды працы з дыялогамі, сведчаць аб цікавасці да іх з боку вучняў, эфектыўнасці.

Такім чынам, для павышэння ўзроўню развіцця маўленчай дзейнасці малодшых школьнікаў на ўроках літаратурнага чытання трэба праводзіць не толькі чытанне па ролях і інсцэніроўкі асобных урыўкаў з твораў, але і іншыя віды працы: знаходжанне ў тэксце рэплікі-рэакцыі на папярэднюю – рэпліку-стымул; узнаўленне па памяці рэплікі-рэакцыі на прачытаную рэпліку-стымул; аднаўленне дыялогу з рэплік, якія трэба паставіць у пэўным парадку; прыдумванне працягу дыялогу; выбар з некалькі рэплік, адной, якая адпавядае па сэнсе дадзенай; напісанне п‘есы паводле вывучанай казкі або апавядання; складанне дыялогу з ветлівымі словамі па прапанаваных тэмах; арганізацыя інтэрв‘ю паводле зместу прачытанага твора і інш.

**Літаратура**


1. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. – Мінск: Гал. рэд. Беларус. Сав. Энцыклапедыі, 1977–1984. – Т. 2: Г–К / рэд. А.Я. Баханькоў. – 768 с.
2. Брызгунова, Е. А. Диалог // Русский язык: Энцикл. / гл. ред. Ф. П. Филин. – М.: Сов. Энциклопедия, 1979. – С. 74–75.
3. Вольскі, А. В. Літаратурнае чытанне: падручнік для 3-га класа устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання: у 2 ч. / А.В. Вольскі, І.А. Гімпель. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012. – Ч. 1–2.
4. Вольскі, А. В. Літаратурнае чытанне: падручнік для 4-га класа устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання: у 2 ч. / А.В. Вольскі, І.А. Гімпель. – 2-е выд, выпраўл. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2013. – Ч. 1–2.


МГПУ им. И.П.Шамякина